Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 20 (519). Вільня, Нядзеля 21 Траўня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл. на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ

У ЧЭСЬЦЬ МАТКІ.

(Замест матчынага дня.)

Жонка-матка ў людзей звычайна мае вялікую пашану і любоў. Аб гэтым сьведча мінуўшчына і сучаснасьць. У асобе маткі чалавецтва бача нешта дужа высокае і сьвятое. На асаблівую-ж моральную вышыню ўзьнясло жанчыну-матку хрысьціянства. Поўны моральнай і поэтыцкай красы культ Маці Божай у Царкве-Касьцеле ёсьць найлепшым гэтага доказам і найпрыгажэйшым завяршэньнем культу мацярынства ў чалавецтве агулам.

Сучасныя хрысьціянскія цывілізаваныя народы Эўропы гэтую прыродную пашану і чэсьць да маткі сяньня падтрымліваюць і разьвіваюць далей. Так напрыклад некаторыя эўропэйскія народы, у тым ліку і нашы суседзі Украінцы і Літоўцы, адзін з дзён траўня пасьвячаюць чэсьці маткі і завуць яго матчыным днём. У гэты дзень гэныя народы ладзяць сабраньні, лекцыі, акадэміі на чэсьць маткі, выясьняючы ўсе тыя многія прычыны, дзеля якіх жанчына-матка на асаблівую чэсьць заслужвае.

Пэўне-ж, было-б дужа пажадана, каб і беларусы, далучаючыся да цывілізаваных народаў, так-жа ў меру сваіх сіл зладзілі матчын дзень, у якім-бы выясьнялі існуючую ў беларускім народзе і абуджалі-б новую чэсьць і любоў да беларускай маткі, якая так варта гэтага, а аб якой сучаснае, асабліва маладое, пакаленьне так лёгкадумна забываецца. Аднак мы добра ведаем, што ў сучасных, сапраўды паганых, бо свайго роду нявольніцкіх, варунках нашага жыцьця, даканаць нам гэтага як належылася-б, покульшто ня ўдасца. Дзеля гэтага справу культу маткі-беларускі парушаем хоць у скромным газэтным артыкуле, ня трацячы пры тым надзеі, што не за гарамі той час, калі беларускае грамадзянства і ўвесь беларускі народ, справу сьвяткаваньня матчынага дня паставіць на належнай вышыні.

Чэсьць для маткі дыктуе людзям сама прырода. У выдаваньні на сьвет і ў гадаваньні дзяцей, а так-жа і ў далейшых адносінах да іх, ужо нават узрослых, роль маткі сапраўды асаблівая. Роль гэта маткі зводзіцца бадай выключна да сталай, бязупыннай, нявычэрпанай любові, а гэта-ж нешта найсьвятлейшае, найбольш вартаснае ў чалавецтве. Знача, за матчыную любоў людзі павінны плаціць так-жа любоўю.

У нас беларусаў сям'я агулам, а матка прадусім, мае вялізарнае, на жаль так мала ў нас зразумелае і цэненае, значэньне для беларускага нацыянальнага жыцьця. Калі дзякуючы гістарычным, няспрыяючым нам, падзеям наступіў занепад нашага народу, калі так званыя вышэйшыя, асьвечаныя нашы клясы пакінулі народ на ласку лёсу, а самі пайшлі служыць чужым багам, тады прадусім беларуская матка, як сьвяшчэньніца, якая асталася старажыць, каб не пагас дазваньня агонь беларускага нацыянальнага жыцьця. Гэта яна, выражаючы сваю матчыную любоў да свайго дзіцяці, шчабятала яму розныя народныя прыгожыя і чулыя словы аб яго долі-нядолі, пяяла над яго калыскай родныя песьні і расказвала казкі, у якіх маляваўся цяжкі быт беларуса і туга за жыцьцём лепшым, захоўвуючы гэтым і разьвіваючы беларускую мову і падтрымоўвуючы ў беларускім народзе асаблівасьць і асобнасьць ягонага нацыянальнага характару.—Зразумелым цяпер станецца для нас, чаму камуністы, якія не прызнаюць нацыянальнасьці, так упорыста і беспашчадна руйнуюць сям'ю і адрываюць дзяцей ад матчынага ўзгадаваньня. Тымчасам з боку беларусаў, як народу і як людзей этычна нармальных, належыцца матцы беларусцы — чэсьць і любоў.

Мае для нас матка беларуска так-жа вялікае значэньне соцыяльнае. Падставай, першым варункам усякага соцыяльнага, грамадзкага жыцьця зьяўляецца ўмеласьць, прывычка нахіляць наша самалюбства, нашы асабістыя справы да спраў людзей другіх, да спраў грамадзкіх. Вось-жа наша беларуская матка першая нас да гэтага прывучае. Сям'я— гэта першая соцыяльная людзкая клетачка, у якой кожнае маладое пакаленьне вучыцца і прывыкае агранічваць, спыняць свае справы асабістыя на карысьць сябраў усей сям'і. Першая-ж роль грамадзкага выхаваўцы ў сям'і бязумоўна належа матцы. Гэтак у сям'і кожнай нацыянальнасьці, а прадусім у сям'і беларускай, бо іншых установаў, якія займаліся-б грамадзкім узгадаваньнем маладога пакаленьня, апрача прыроднай установы сям'і, у нас так як і няма сусім.

Далей, беларуская матка заслужвае на асаблівую пашану з нашага боку і затым, што яна ў нашым беларускім жыцьці зьяўляецца першай і найважнейшай агулам узгадавацелькай кожнага маладога нашага пакаленьня. Няма ў нас роднай школы, няма бадай ніякіх іншых узгадаваўчых установаў, у якіх беларуская моладзь гадавала-б свой характар, разьвівалася-б этычна і культурна. Пачаткі — і прытым часта добрыя пачаткі— гэтага ўсяго мы маем у сям'і прадусім ад беларускай маткі. Дзеля гэтага лёгка зразумець, чаму наша моладзь, тая нямногая, якая патрапіла выйсьці з роднага сяла ў горад на службу, ці на вышэйшую нават навуку, спачатку, покуль матчын уплыў, матчына ўзгадаваньне ў ей ня выветрылася, моладзь гэта— кажам — часта дужа сымпатычная, працавітая, этычная, па свойму культурная, а пасьля, забыўшыся аб матчынай школе, з новай школы не карыстае, або карыстае дзіўна мала і хоць інтэлектуальна часта разьвіваецца цалком памысна, то этычна, грамадзка і агулам культурна апускаецца, дзічэе. Ведама, з гэткай моладзі карысьці для беларускай справы народнай і соцыяльнай гэтулькі, колькі з казла малака.

Належа ўрэшце матцы-беларусцы глыбокая любоў і пашана за яе цяжкую, часта гэроічную працу, за яе вытрываласьць, за любоў і ахвярнасьць, а так-жа за ўсе тыя ціхія, але творчыя і высокацэнныя заслугі для беларускага народу.

Ліквідацыя прадаўжаецца.

У мінулым тыдні дырэкцыі беларускіх філіяў дзяржаўных гімназіяў у Вільні і ў Наваградку атрымалі ад Школьнага Куратара паведамленьні аб тым, што сёлетнія матуральныя экзаміны ў абедзьвюх гімназіях маюць адбывацца сумесна з „мацежыстымі“ гімназіямі польскімі. Гэткі крок над'зорчых школьных уладаў выклікаў, рэч зразумелая, у вучнёўскіх радох буру пратэстаў, а вучні беларускай філіі ў Вільні ў самаабароне загразілі забастоўкай і галадоўкай. Пры гэткай сытуацыі прэзыдыум бацькаўскага К-ту гэтае-ж гімназіі (філіі) змушаны быў даведацца да адпаведных уладаў у Куратарыі, гдзе было сказана, што... „виноватъ стрѣлочникъ“: вінавана, быццам, машыністка, якая гэткую паперу напісала праз памылку... У выніку ўсяго гэтага справа самастойнасьці матуры ў беларускіх гімназіях (філіях) на гэты раз яшчэ адваявана. У справе Наваградзкай гімназіі (філіі) даведваўся да Кураторыі дырэктар Я. Цеханоўскі.

Адчыненай затое дагэтуль астаецца яшчэ справа пэрсональнага складу вучыцялёў названых гімназіяў (філіяў). — Цэлы рад вучыцялёў атрымаў паведамленьне Кураторыі аб звальненьні іх з канцом гэтага школьнага году. Матывы звальненьня пераважна быццам фармальныя: нястача кваліфікацыяў. Ёсьць аднак падстава думаць, што звальненьне адбылося паводле ключа іншага, бо сярод звольненых знаходзіцца напр. і Кс. Адам Станкевіч, якому хіба-ж і Кураторыя ня зможа паставіць закіду „некваліфікаванасьці“, а які ў дагэтуляшнім складзе Пэдагогічнай Рады беларускай філіі ў Вільні зьяўляўся бадай адзіным незалежна думаючым беларусам і які працаваў у гімназіі далёка перш яшчэ, чымся туды пралажылі сабе дарогу самыя паны сяньняшняга палажэньня: Кс. Станкевіч працаваў у Віл. беларускай гімназіі ад ейнага заснаваньня.

Гэтак — у кароткіх словах — стаяць справы беларускіх гімназіяў цераз няпоўных 8 месяцаў ад часу іхнага „упаньствовеня“. Куды ўсё гэта кіруецца, — дадумацца ня трудна.—Тым выразьней на гэтым фоне зарысоўвуецца асоба павадыра „упаньствовеня“ беларускіх гімназіяў Ант. Луцкевіча, які, зрабіўшы сваё, спрытна „захварэў“ і ў пару ўцёк з старшынства бацькаўскага К-ту: ён заўсяды ўцякае „у пару“, бо мае добры нюх. Тымбольшая ягоная адказнасьць за нішчэньне здабычаў усяго беларускага грамадзянства

Г. К.

Каля справы Уніі.

Некалькі гадоў праводзіцца ўжо ў нашым краю сярод беларусаў рэлігійная Унія— злучэньне праваслаўнай Царквы з каталіцкім Касьцёлам. Каля гэтай вялікай у сутнасьці справы закруцілася і палітыка, якая шкодзіць і рэлігійнай справе і беларускаму народу.

Да гэтай пары кіравала і кіруе (пакульшто) унійнай акцыяй на нашых землях рымская камісія „Pro Russia.“ Але ў гэтым кіраўніцтве мелі і маюць голас, калі ня зусім рашаючы, дык моцна дарадчы і польскія біскупы. Апрача гэтага, справай уніі на нашых землях моцна пачалі цікавіцца польскія палітыкі.

У выніку гэтага „зацікаўленьня“ справай уніі з боку польскай палітыкі, пачалася прэсавая атака супроць камісіі „Pro Russia,“ якая, праводзячы ў нас унію, трымалася ў рэлігійным жыцьці накінутай праваслаўным беларусам расейшчыны, хоць у некаторых прыходах заводзіла ў цэрквы і мову беларускую, і моцна бараніла накідаць польшчыну праваслаўным беларусам перайшоўшым у унію. У гэтым вось і ўся віна камісіі „Pro Russia“ прад польскай палітыкай, супроць чаго так голасна крычала польская прэса. Але крык гэны аказаўся не бяз скутку. Справа уніі, ці лепш сказаць — рэлігійна-унійная палітыка пачала перахіляцца ў бок палітыкі польскай.

У зьвязку з гэтай перавагай „дыплёматычна“ пераведзены з пінскай каталіцкай

241098

духоўнай сэмінарыі на сэкрэтара біскупа Чарнэцкага ў Варшаву кс. д-р К. Кулак (беларус), які ўжо і з Варшавы, як чуваць, пераводзіцца ў Віленскую дыэцэзію. Гэтакім парадкам кс. д-р. Кулак аддзелены ад унійнай справы.

Другой красачкай гэтай перавагі унійнай палітыкі ў бок польскага нацыяналізму зьяўляецца факт падгатоўкі да скліканьня IV унійнай конфэрэнцыі ў Пінску, якую ўжо ладзяць эндэцкага пакрою польскія ксяндзы.

Словам, пад загадамі камісі „Pro Russia" з Рыму, у Пінску пачынае ўжо дзеяць камісія „Pro Polonia". Спадзяёмся, што ніводзін беларус, шануючы сябе і рэлігійную справу на Беларусі, учасьнікам гэтай конфэрэнцыі ня будзе. В. В.

З беларускага жыцьця.

Матуральныя экзаміны ў Віленскай беларускай гімназіі. Пісьменныя экзаміны для абсольвэнтаў Віленскай беларускай гімназіі пачынаюцца ў панядзелак 22 траўня с.г. Апрача абсольвэнтаў гімназіі да экзаміну прыступаюць пяць чалавек экстэрністаў. Экзаміны вусныя працягнуцца да другой паловы чэрвеня. — У гэтым-жа часе назначаны і экзаміны для абсольвэнтаў беларускай філіі дзяржаўнай гімназіі ў Навагрудку.

Справа Т. Б. Ш. ў Віленскім Апэляцыйным Судзе разглядалася дня 18 г. м. Суд зацьвердзіў прысуд І-ай інстанцыі, паводле якога апраўданы: Ф. Стэцкевіч, М. Пяткевіч і Р. Шырма, а засуджаны: Саковіч, Цэрах і Скурка.

† М. БАБАРЫКА.

27.IV. с. г. ў в. Палесьсе, Будслаўскай гм. памерла М. Бабарыка, маці сябры Ц.К.—Б.Х.Д. Балеслава Бабарыкі.

Рэдакцыя „Б. Крыніцы" выражае грам. Б. Бабарыцы свой спогад.

З жыцьця Літоўцаў.

Закрыцьцё дзевяцёх літоўскіх школ. У мінулым тыдні ў віленскіх польскіх газэтах паявілася вестка, што ў канцы 1932/3 школьнага году загадам Віленскага Школьнага Куратара зачыняюцца наступныя прыватныя літоўскія школы: у Заборніках і Кейжах — Браслаўскага пав., у Паажолах і Белюнах — Лідзкага пав., у Дзіджулях — Ашмянскага пав., у Вайцюлішках, Жагарах і Палюнах — Сувальскага пав., у Пелягрындах — Віленскага пав. Цікава адзначыць, што ўсе гэтыя школы закрыты з прычыны „неадпаведнага" памешканьня. Ведама, гэткія прычыны знайсьці лёгка.

„Дзень Вільні". Як падаюць газэты, 14 траўня сёл. г. Літоўцы ў Незалежнай Літве ладзілі „Дзень Вільні". Вечарам прад гэтым сьвятам дзесяць трубачоў абвяшчалі па Коўне сьвяточны заўтрашні дзень. 14 траўня ўся Коўна была прыбрана народнымі сьцягамі, а ў вокнах былі выстаўлены абразы закладчыка Вільні Гэдыміна, Пагоні і Гэдымінавага замку. Уна ўсіх Ковенскіх касьцёлах былі набажэнствы і адпаведныя казаньні.

Найбольш урачыстай хвілінай сьвяткаваньня „Віленскага дня" была народная прысяга, у якой узялі ўдзел усе Ковенскія арганізацыі і вялікія грамады народу. Z.

З Польшчы.

А сялянства дык і ня прыкмецілі. Міністэрства асьветы выдала распараджэньне, якое дапаўняе цыркуляр аб школьных таксах у гімназіях і іншых сярэдніх дзяржаўных школах. Паводле гэтага распараджэньня з пачаткам 1933-34 школьнага году звальняцца ад аплаты школьнай будучь у першую чаргу дзеці беззработных чыноўнікаў і іншых умысловых працаўнікоў. Аб дзяцёх сялянскіх ня сказана ў гэтым распараджэньні ані аднаго слова. А палажэньне сялян у Польшчы куды горшае ад палажэньня чыноўнікаў.

І для нашага сялянства гэта наглядны прыклад, які паказвае, што трэба арганізавацца, каб здабыць асьвету. Нашае сялянства павінна ведаць, што ніхто яму не паможа, калі ня будзе мець сваіх вучоных людзей, дык і само сваей справы не абароніць. Дзеля гэтага трэба вялікай лучнасьці сялянства ў арганізацыі, каб змагчы абараніць свае правы.

Колькі вінаваты двары парабком і падзённым работнікам? Польскі цэнтральны саюз земляробска — гаспадарскіх работнікаў аблічыў, што ўсе двары цэнтральнай Польшчы вінаваты за 1932 год вялікай масе народу — падзённым работнікам і парабком вялікую суму грошай, бо разам каля 3 мільёнаў зл. Такую вялікую суму вінаваты двары тым людзям, якія жывуць з рук працы на панскіх абшарах. У 1931 годзе гэны доўг багатых бедняком крыху меншы, але таксама паважная сума — 1 мільён 800 тысяч зл.

Кража 130 тысяч зл. Нядаўна натрапілі ў міністэрстве „Opieki Społecznej" на сьлед кражы вялікай сумы грошай. Праведзенае сьледзтва выявіла, што чыноўнік Кулік з таварышамі здолеў „здэфраўдаваць" аж 130 тысяч зл.

Дзяржаўны дэфіцыт. Дзяржаўны бюджэт за м-ц красавік с. г. даў скарбу 15 мільёнаў зл. дэфіцыту (недабору грошай).

Берасьцейскі працэс будзе разглядацца нанова. Ведамы берасьцейскі палітычны працэс, у якім выдатныя людзі Польшчы з пэрыяду „прадмаёвага" засуджаны былі на кару вастрогу, быў заскаржаны абаронай засуджаных у Найвышэйшы Суд. Найвышэйшы Суд скасаваў гэты прысуд і цэлую справу загадаў разглядаць нанова у Варшаўскім Апэляцыйным судзе ў зьмененым складзе. Паноўны суд абдудзецца 10 ліпня с. г.

Забойства эндэцкіх дзеячоў. У мінулую нядзелю ў адней вёсцы ў Галіччыне адбыўся мітынг наладжаны польскай эндэцыяй. Пасьля мітынгу арганізатары яго сабраліся да мяйсцовага ксяндза. Калі арганізатары гаварылі між сабою на ганку плебаніі, нехта ў іх выстраліў з стрэльбы набітай шротам. Выстрэл сьмяротна раніў маёра Овоца і магістра Худзіка. Худзік скора памёр, а Овоц, ранены моцна, яшчэ жыве.

Kastuś Kalinoŭski, „Mužyckaja Praŭda" i ideja Niezaležnaści Biełarusi.

(Referat Ks. Ad. Stankiewiča, pračytany na ŭračystaj Akademii 25.III.33 h., z pryčyny 15-ych uhodkaŭ abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi i 70-ych uhodkaŭ biełaruskaj presy. Drukujem pawodle stenahramy).

(4).

V. „Mužyckaja Prauda".

Užo z taho, što my skazali, asabliwa z charakterystyki taho času i tych warunkaŭ, u jakich žyŭ K. Kalinoŭski i z jaho karocieńkaj i duža pawiarchoŭnaj biohrafii bačym, što Kalinoŭski heta byŭ biełaruski narodnik, jaki zmahaŭsia pradusim za socyjalnyja prawy biełaruskaha narodu, a tak-ža i za jaho wolu palityčnuju ŭ sensie, jak ab hetym nižej ubačym, federacyi z Polščaj, jak sapraŭdy „wolnyja z wolnymi i roŭnyja z roŭnymi". Hety jahiellonski — padčorknuty Lublinskaj Unijaj — ideał u im žyŭ, jak bačym, jašče mocna i mieŭ jašče wialikaje značeńnie.

U hetkim sensie, ale kudy ŭ jarčejšych i wyraźniejšych formach, pradstawicca nam asoba Kalinoŭskaha, kali my pryhledzimsia da tych drukawanych dakumentaŭ, jakija pa im astalisia i kali prysłuchajemsia da charakterystyki jaho jak palityka, jakuju jamu dajuć tyja asoby, z jakimi jon spatykaŭsia, supracoŭničaŭ, a nawat i zmahaŭsia, abstawijučy swaje narodnickija biełaruskija idealy.

Jak-ža wymoŭna ab hetym świedča jaho biełaruskaja „Mužyckaja Praŭda", jakoj siańnia światkujem 70-tyja ŭhodki, a tak-ža i jaho inšyja biełaruskija druki! Pryhledzimsia da ich bližej. Začniom ad „Mužyckaj Praŭdy".

U biahučaj biełaruskaj literatury, a tak-ža i ŭ niebiełaruskaj dahetul zwyčajna panawała prakanańnie, što Kalinoŭski pačaŭ wydawać swaju „Mužyckuju Praŭdu" ŭ 1863 h., kali wybuchła paŭstańnie. Tymčasam treba wiedać, što „Mužyckaja Praŭda" wychodziła užo ŭ 1862 h. Takim čynam sioleta letam jej užo prypadaje 71 hod. My światkujem siańnia 70-tyja ŭhodki hetaj hazety, bo siańnia prypadajuć 15-tyja ŭhodki abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi, z čym jubilej „Mužyckaj Praŭdy" i łohična i ideowa tak strojna harmanizuje!

I tak № 1 biełaruskaj hazety „Mužyckaja Praŭda", jakuju wydawaŭ i redahawaŭ Kalinoŭski, byŭ užo ŭ abiehu pa siołach Biełastoččyny ŭ pałowie lipnia 1862 h., a № 2 tam-ža kursawaŭ u pačatku wierašnia taho-ž hodu. Ab hetym danosić ministru ŭnutranych spraŭ Horadzienski hubernatar u piśmie 17.IX.1862. za № 12. (*Миловидовъ — Архивные матеріалы Муравьевскаго Музея т. I 144*).

№ 1 „Mužyckaj Praŭdy" — heta siańnia wialikaja redkaść. Pawodle čutak jošć adzin ekzemplar jaho ŭ Biełaruskaj dziaržaŭnaj bibliotecy ŭ Miensku.

№ 2-ha znachodzicca adzin ekzemplar u Gustawa Loubisse-Bissier u Waršawie (Krakowskie Przedm. 30).

№ 3-ha — adzin ekzemplar u bibliotecy im. Wróblewskich u Wilni. Čas wychadu ŭ świet niawiedamy.

№ 4 tak-ža duža redki i mała wiedamy. Pawodle čutak jošć jaho adzin ekzemplar tak-ža ŭ Miensku, razam z numaram pieršym.

№ 5-ha adzin ekzemplar znachodzicca ŭ uspomnienaj bibliotecy im. Wróblewskich, a dwa ŭ Dziaržaŭnym Archiwie ŭ Wilni (byŭšy Muraŭjoŭski Muzej) pad № 18/63 u „Sledstwiennym diele" ab „wozmutitielnom listkie": „Mužyckaja Praŭda", znajdzienym palicyjaj u Dziśnienskim pawiecie. Numar hety byŭ u abiehu ŭ pačatku lutaha 1863 h.; na sledčych aktach zaznačana, što śledztwa pačata 4.II.63. Znača, numary 3 i 4 musili wyjści ŭ świet u kancy 62 ci ŭ pačatku 63 hodu.

№ 6 „Mužyckaj Praŭdy" — u dwuch ekzemplarach — znachodzicca tak-ža ŭ Dziaržaŭnym Archiwie ŭ Wilni, razam z numaram piatym u sprawie ab uspomnienym „wozmutitielnom listkie". Numar hety tak-ža byŭ najdzieny ŭ pačatku lutaha 1863 hodu ŭ Dziśnienščynie.

№ 7 „Mužyckaj Praŭdy", likam dziesiać štuk, znachodzicca tak-ža ŭ Dziarž. Arch. u Wilni („*Audit. Pol." Nr. 1320—1322 T. 1. bač. 270*). Hety numar byŭ palicyjaj znajdzieny až uwosień 1864 h. u Pružanskim pawiecie niedaloka dwara Kiwatyčy, taho ŭłaśnicy Bohusłaŭskaj. U śledčych aktach haworycca, što heta „polskija rewolucionnyja prokłamacyi".

„Mužyckaja Praŭda" drukawana łacinkaj, dawoli čystaj biełaruskaj mowaj, z horadzienskimi asabliwaściami, na dwuch bačynach adnaho listka raźmieram waśmiorki. Krychu bolšy ad inšych № siomy. Napieradzie „Mužyckaj Praŭdy" zaŭsiody staić №, a ŭ kancy aznačana, što kaštuje: hrošy 5. Usie numary padpisany mianiuškaj — Jaško Haspadar z pad Wilni. Ustalena siańnia napeŭna, što pad hetaj mianiuškaj kryjecca Kastuś Kalinoŭski.

Kab bližej zapaznacca z źmiestam „Mužyckaj Praŭdy", pazwolu sabie tut prytačyć uwieś numar 2, jak z wiedamych najraniejšy i jak najbolš charakterny. Woś jon:

Dzieciuki!

Kali Boh stwaryu usich ludziej wolnymi i usim dau adzinakuju duszu, tak skulże heto uziało sia, szto adzin marnuje da i nad ludźmi zbytkuje, a druhi biedny panszczyznu służyć, albo abroki i kaznu płacić.

Kożny pa swojemu tałkuje, na swaju storonu ciahnie. Car każe szto jon dobre nam dumaje a pany każuć, što jany dobre dumajuć nam zrabici, a mużyk biedny ad ich dabrości jak prapadał tak i prapadaje.

Kab rastałkawać ludziam u czom prauda, ja piszu piśmo, a pisau budu jak Boh i sumlenie każe, wy jano mienie takoho samoho mużyka jak i wy, pasłuchajcie dobre. Byu to kaliści narod nasz wolny i bahaty. Nie pomniać hetaho naszyje baćki i dziedy, no ja wyczytau u starych książkach, szto tak kaliści bywało. Panszczyny tahdy nijakoj nie było. I niema czeho tamu dziwowaci sia, bo było lesu szmat, pola kolki choczesz, a ludziej to mało, tak nasztoś służyć panszczynu za ziemlu, kali kożny moh lesu wycierabić, chatu sabie pastawić i mieci swaje pole.

No u susiedztwie z nami żyu Niemiec i Maskal. Adnamu i druhomu bahactwo nasza-

З заграніцы.

Нямеччына ня хоча вайны, а толькі рэвізіі Вэрсальскага трактату. Гітлер хоча даказаць усяму сьвету, што Вэрсальскі трактат трэба паддаць перагляду і верыць, што зьмену граніц можна правясьці і без вайны. У гэтым напрамку сучасны ўрад Нямеччыны і праводзіць сваю заграні́чную палітыку. Канцлер Гітлер гаварыў у гэтай справе з польскім паслом ў Бэрліне. Гутарка адбылася ў прысутнасьці міністра заграні́чных спраў Нямеччыны Нойрата. У гэтай гутарцы Гітлер запытаў у польскага пасла, што азначаюць процінямецкія ваенныя трывогі ў Польшчы і заявіў, што такой трывогі проціў Польшчы ў Нямеччыне няма. Аб справе ж зьмены граніц з Польшчай нямецкі ўрад гаворыць толькі ў плошчы перагляду мірных дагавораў. Пры гэтым Гітлер запратэставаў проціў выпрабленьня ваенных настрояў, якія псуюць і так цяжкое палажэньне Эўропы.

Гутарка Гітлера з польскім паслом у Бэрліне цьвяроза падзеяла і ў Варшаве. Польскі міністр заграні́чных спраў Бэк запрасіў да сябе нямецкага пасла ў Варшаве і запярэчыў, што быццам Польшч імкнулася да вайны. Мін. Бэк заявіў, што Польшч мае намер рашуча трымацца ў рамах існуючых мірных дагавораў.

Гэтымі заявамі і кончылася дыплёматычнае „зблі́жэньне“ Нямеччыны з Польшчай, якое ў сутнасьці нічога не зьмяніла.

Другім знаменным фактам у гэтым кірунку паступаньня нямецкага ўраду зьяўляецца ратыфікацыя (пацьверджаньне) савецка-нямецкага „бэрлінскага дагавору,“ які ёсьць дапаўненьнем ведамага „раппальскага дагавору.“ Ратыфікуючы гэты дагавор урад Гітлера хоча даказаць сьвету, што Нямеччына мае вялікую нутраную сілу, якая дазваляе ўтрымаць добрыя адносіны з СССР. і адначасна нішчыць без аглядкі ўсялякія праявы бальшавізму ў сябе дома. Ратыфікацыя „бэрлінскага дагавору“ выявіла, што Нямеччына імкнецца да сваей мэты шляхам дыплёмацыі, без памахіваньня шабляй і адначасна пагасіла надзеі Польшчы на карысьці, якія маглі-б быць з нямецка-савецкай варожасьці.

Аб Вэрсальскім дагаворы Гітлер афіцыяльна сказаў гэтак: «Гэны дагавор зьяўляецца жаралом ўсялякага няшчасьця... Спадзяюся, што зьмены яго даб'ёмся шляхам мірных перагавораў... Наш лёс у першую чаргу зьвязаны з граніцамі на ўсходзе.“

У зьвязку з вышэйсказаным акрэпла нанова прапаганда рэвізіі Вэрсальскага трактату галоўна ў Англіі, Амэрыцы і ў Францыі.

Францыя згаджаецца на перагляд граніц, але баіцца вайны. Справа нахіленьня Францыі да Італьянска-Англійска-Нямецкага блёку, які мае на мэце перагляд граніц у Эўропе, знаходзіцца ўсё йшчэ ў сфэры перагавораў і выясьніцца хіба на лёндынскай сусьветнай эканамічна-палітычнай конфэрэнцыі 12 чэрвеня с. г.

Даволі выразнае становішча Францыі ў адносінах да гэтай справы выяўляе заява міністра заграні́чных спраў Францыі Поль Бонкура, які ў францускім сэнаце заявіў, што Францыя згадзілася-б на рэвізію мірных дагавораў, але толькі ў рамах Лігі Народаў. Між іншым П. Бонкур сказаў гэтак: „Наколькі бязглузьдзіцай было-б прыступаць у цяперашнім стане Эўропы да рэвізіі граніц так, каб выклікаць магчымасьць вайны, на гэтулькі бязглузьдзіцай было-б цьвердзіць аб нятыкальнасьці існуючых дагавораў.“

Гэная заява П. Бонкура ў Польшчы выклікала паважнае нездаваленьне.

Падзеі на Далёкім Усходзе. Манджурскі ўрад афіцыяльна абвесьціў прылучэньне да Манджурыі правінцыі Хінган, паложанай у г. зв. нутранай Манголіі. Захоп Хінгану адбыўся без праліцьця крыві.

Савецкія газэты падаюць, што Японія, праз Манджурыю, пачала захапляць Манголію з мэтай стварэньня „незалежнай“ Манголіі, па выпрабаваным рэцэпце на Манджурыі.

У Маскве адбыліся перагаворы між савецкім камісарам Молатавым і кітайскім паслом, у справе заключэньня дагавору між Саветамі і Кітаем аб ненападаньні. Газэты пішуць, што ў гэтым дагаворы мае быць устаноўлены і такі пункт: калі Японія нападзе на Кітай, дык Саветы маюць памагаць ў вайне Кітаю.

Савецка-польскае зблі́жэньне. Апошнімі часамі заўважваецца што раз то мацнейшае савецка-польскае зблі́жэньне. Дня 1 мая с. г. савецкі полпрэд у Варшаве Овсеенко адведаў марш. Пілсудзкага, з каторым доўга гутарыў.

Польскае пасольства ў Маскве ўрачыста сьвяткавала 3-га мая. На польскай урачыстасьці былі вышэйшыя прадстаўнікі савецкага ўраду.

Прыехаўшая ў Польшчу савецкая гандлёвая дэлегацыя, на чале з заступнікам камісара заграні́чнага гандлю Боевым, выклікала пэўную сымпатыю між Польшчай і СССР. Боеў у гутарцы з карэспандэнтам „Слова“ заявіў, што гандлёвыя зносіны Польшчы з Саветамі разьвіваюцца вельмі добры. Польскія тавары ў Саветах маюць добры рынак. Далей трэба спадзяецца, што гэтыя адносіны яшчэ больш ажывяцца.

УСЯЧЫНА.

Усё наадварот. Цяпер такія часы, што ўсё на сьвеце наадварот. Хлеба за шмат, а мільёны людзей галодных. Рознага тавару за многа, а людзі ходзяць абдзёртыя. Золата поўна, а грошай ніхто ня мае. Гавораць аб разаружэньні і ўсе прыгатаўляюцца да вайны. Словам, усё цяпер дагары камлём.

Гэткаму пераваропу ўверх камлём падаліся і соцыялістычныя партыі. Дагэтуль агульна было ведама, што соцыялісты дамагаліся палёгкі працоўным масам, а цяпер наадварот. Сёлета ў дзень 1 мая II інтэрнацыянал (гэтак называецца міжнародная соцыялістычная арганізацыя) заявіў, што соцыялісты дамагаюцца для работнікаў менш, чым даюць работнікам капіталісты. У адозве II інтэрнацыяналу выданяй на 1 мая с. г. сказана, што работнікі павінны дамагацца 40-гадзіннага рабочага тыдня, а амэрыканскія капіталісты выступілі самі з праектам увясьці 30-гадзінны рабочы тыдзень, каб праз гэта зьменшыць безрабоцьце.

Словам, жыцьцё папераджае і соцыялістычныя праграмы.

---

je kałoło u oczy — kab ich tak kolka schapiła, da i chacieli nas zahnać z naszej baćkouszczyny. Treba było baranici sia, to Karol każe chadziem baranici, a tut nie usie iduć, da i mało naszych paszło.

Wyhnali to Maskala i Niemca no kab żenki da i dzieci hetych szto chadzili na wajnu mieli za czym prażyci, tak Karol nasz i napisau takoje prawo: Hetyje szto nie choczuć iści baranici swajej ziemli, niechaj abrablajuć pole hetym szto bjuć sia za wolnaść i szczaście usich. I hetak było douho: adnie baranili kraju, a druhije to harali to siejali, to kasili, to żali. Z hetul to i uziałasia heta panszczyna. Sudzieceż ciepier sami czy możno było zrabici sprawiedliwiej jak zrabiu kaliści nasz Karol Polski da i Litoŭski? No kali Maskal z Niemcom chitrościeju nas padbiŭ i paszou rąd maskouski, tak i usio zrabiło sia pa czartousku.

Stau zaraz Maskal swoj rąd uwodzić u naszom kraju i każe: Mużyk dawaj rekruta, mużyk dawaj padatki, da i panszczynu jeszcze służy, albo płaci abrok u kaznu! Tak jakajaż tut uże sprawiedliwość, kali usieńko szto ciażko zwalajuć na mużyka, kali z jeho dzieruć astatniu szkuru, bjuć i płakać nie dajuć! Aczuniali to byli mużyki, uhledzieli szto kiepsko, daj dawaj buntawaci sia pad Kaściuszkaju, a Kaściuszko to każe: kali mużyki choczuć uże sami baranici swaju ziemlu, tak niechaj że nie służać panszczyny, da i nie płaciać u kaznu abroku za ziemlu. Ot heto tak sprawiadliwość! No sztoż kali Maskal spyniu Manichwest Kaściuszki kab nie pabuntawaci usich mużykoŭ. Dla taho to i pabili Maskale Kaściuszku, bo kab mużyki usie razom byli zbuntawali sia i uchapili za sakiery, naży i kosy, takby Maskal musieuby prapaści bez prastania i my na wiek wiekou uże byliby wolnyje.

Tak z hetaho piśma i widno, szto mużyki panskije i kazionnyje nie pawinni płacić ani czynszu panom ani abroku u kaznu za ziemlu, bo heta ziemla da nas należyć, no kali budzie wajna z Maskalom za naszu wolnaść, to toj czas treba usim iści na wajnu prociŭ Maskala. A to dla taho: kab chuczej prahnać Maskala z jeho sabaczym rądom i kab nikoli nijakoj nikomu mużyki panszczyny nie służyli i nijakaho u kaznu abroku nie płacili i kab na wiek wiekou narod nasz byu wolny i szczaśliwy. A kali was chto budzie padmaŭlać rabici inaczej; czy to Spraunik, czy to Akrużny, czy jo Łapsesor, czy to Pan, to wy jeho nie słuchajcie bo to peuno aszukaństwo, szto za carskije albo panskije hroszy wiecznoj naszej zhuby chocze!!

Jaśko haspadar z pad Wilni.

Kasztuje hroszy 5.

(*Z adpisu p. Ramana Kiersnoŭskaha: Pošta Derewna k/Słonima; dwor Čemerešnik*).

Z prytočanaha numaru „Muž. Praŭdy“ bačym, što ŭ pieršuju čarhu Kalinoŭski zaklikaje biełaruskich sialan, kab jany nie płacili padatkaŭ ani ŭradu rasiejskamu, ani polskim panom, kab nie chadzili na panščynu, kab nie dawali rasiejcam rekruta, a rychtawalisia da paŭstańnia prociŭ rasiejcaŭ, kab, jak budzie paŭstańnie, razam z palakami jšli bić maskaloŭ, bo — kaža — wajna hena budzie „za našu wolnaść“, wajna hena budzie na toje, „kab narod naš na wieki wiekaŭ byŭ wolny i ščaśliwy“. Peŭnie-ž, hetyja častyja dumki ŭ Kalinoŭskaha ab wolnaści ŭ pieršuju čarhu datyčać wolnaści socyjalnaj, ale adnačasna padčorkiwajucca ideały i wolnaści ahułam, znača — wolnaści swajho rodu narodna-palityčnaj.

Ab imknieńni Kalinoŭskaha da zdabyćcia biełaruskamu narodu ŭ niekatorym značeńni narodna-palityčnaj samastojnaści ŭłasnaj baraćboj hetaha narodu i ab tym, što razwažaŭ jon hety narod i kraj ahułam, jak niešta całkom samastojnaje, rožnaje ad Palakoŭ i Polščy, bačym miž inšym tak-ža z hetkich wyražeńniaŭ u nastupnych №№ „Muž. Praŭdy“. Woś jany:

...„Nam wolnaści treba nie takoj, jakuju nam car schoča daci, no jakuju my sami mužyki pamiež saboju zrobimo... Niama čaho ždaci ad niekaha, bo toj tolki žnie, chto pasieje“ (*Nr. „3 Muž. Pr.“*).

...„Pad maskalom zabyci treba, što jość u nas naša baćkaŭščyna“ (*Nr. 5 „Muž. Pr.“*).

...„U Polščy mužyki taksama, jak i wy spadziejališ na cara...“

...„Pamoh-by i nam Prancuz, jak pamahaje mužykom u Polščy, ale mužyki maŭčać, a car kaža, što jany dawolny...

...„Nie tak dumali mužyki u Polščy... Stańmo družna razom za našuju wolnaść... A budzie ŭ nas wolnaść, jakoj nia było našym dziedam i baćkam (*Nr. 7 „Muž. Pr.“*).

Sapraŭdy, hetyja častkowyja wybarki z „Mužyckaj Praŭdy“ wymoŭna nam świedčać, što Kalinoŭski ŭważaŭ biełaruski narod za narod samastojny, asobny ad Palakoŭ, bo wyrazna jaho ad Palakoŭ adrožniwaje.

Ahułam-ža kažučy — źmiest numaroŭ „Mužyckaj Praŭdy“, aprača 1 i 4, jakich bačyć mnie nie ŭdałosia, padobny bolš-mienš da źmiestu numaru druhoha, tolki pierakazany inšymi sławami dy bolš harača ŭ ich zaklikaje Kalinoŭski biełaruskich sialan nie dawać rasiejcam rekruta.

Za toje numar šosty „Mužyckaj Praŭdy“ stanowić swajho rodu asabliwaść — jon uwieś całkom paświačany sprawam relihijnym, ci ściślej kažučy: sprawie pawarotu prawasłaŭnych biełarusaŭ u uniju.—Hetkaha rodu zaklik Kalinoŭskaha da biełarusaŭ całkom zrazumieły. Likwidacyja unii (jak i jaje zawodžańnie, ab čym narod zabyŭsia), była złučana z mnohimi hwałtami, ab čym u narodzie była jašče tady žywaja tradycyja. Woś-ža Kalinoŭski žadaŭ zakranuć hetu balučuju ranu, kab i na adcinku relihijnaha žyćcia ŭzbudzić u našym narodzie nienawiść da carskaha na Biełarusi panawańnia. Urešcie wystupleńnie našaha paŭstanca za relihijnuju uniju možna tak-ža tłumačyć, jak prynamsi padświedamaje imknieńnie biełaruskaj jaho dušy da šukańnia syntezy, da šukańnia mocnaha i najbolš adpawiednaha hruntu da zakapańnia relihijnaha rowu, jaki raździor biełaruski narod na dźwie warožyja časki. Hetkim hruntam, hetkim sposabam, u wačach jaho susim ščyra mahła rysawacca imienna unija.—Hetaja-ž samaja tema krychu začaplajecca i ŭ numary siomym „Mužyckaj Praŭdy“.

(d. b.)

Гаспадарчыя весткі.

Прывучаюцца да скромнасьці і лапцяў. Статыстыка эканамічнага жыцьця выяўляе, што ў Польшчы людзі прывучаюцца да скромнага жыцьця і да лапцяў. Гэная статыстыка выказвае, што ў Польшчы з кожным годам зьмяншаецца консумцыя (спажыцьцё) такіх прадуктаў, якія належаць да люксусовых.

У 1930 годзе ў Польшчы прадана тутуну за 704 мільёны зл. У працягу 1931 і 32 гадоў курцы пачалі менш курыць і ў 1932 г. скурылі тутуну ўсяго на 552 з палавінай мільёны зл. Таксама перастаюць і па шмат піць гарэлкі. У 1930 г. выпілі 37 мільёнаў 300 тысяч літраў гарэлкі, а ў 1932 годзе — 22.800.000 літраў. Панізілася так-жа консумцыя піва. Апрача гэтага, пачалі менш драць і абутак. У 1930 г. прадана падэшвы-скуры 9 мільёнаў 400 тысяч кілёграмаў, а ў 1932 г. прадана гэтага тавару толькі 8 мільёнаў кілёграмаў.

Гаспадарчая бязглуздзіца. — У Эгіпце спалілі мноства баваўны, бо ня было каму купляць і баяліся, каб на яе ня ўпала цана.

Брэтонскія рыбаловы (Францыя) выкінулі ў мора назад 500 тысяч селядцоў, бо ўважалі, што зашмат злавілі і дзеля гэтага прыдзецца таней прадаць.

Мэксыканскі ўрад выдаў загад нішчыць фрукты, каб не згніліся ў складах. — Цэны аднак на ўсе гэтыя прадукты не падняліся.

Безработцьце. Паводле афіцыяльных даных, безработных у Польшчы ў пачатку гэтага м ца налічана 251.886 асоб.

З ВІЛЬНІ

Рэвізія ў Літоўцаў. Апошнімі днямі паліцыя даканала рэвізіі сярод Віленскіх літоўцаў. Рэвізія даканана на Антокалі і ў іншых ваколіцах места. Падробнасьцяў гэтай рэвізіі да публічнага ведама яшчэ не падаюць.

Самагубства і кража цукру. Надовячы застрэліўся дырэктар складу цукру ў Вільні Акц. Супалкі ў Пазнані, Рушкевіч. Сьледзтва выявіла, што дырэктар прадаў 300 мяшкоў цукру і грошай не перадаў куды трэба, а палажыў сабе ў кішэнь. Апрача гэтага, набраў ён ад купцоў задаткаў на цукар больш 10 тысяч зл. і таксама палажыў у кішэнь. Рушкевіч застрэліўся, як убачыў, што прыехаў да яго кантроль паглядзець на парадкі ў складзе цукру.

Трэці Паўночны Кірмаш арганізуецца сёлета ў Вільні ў канцы м ца жніўня і ў пачатку верасьня. Прыгатаваньні да гэтага кірмашу ўжо пачаліся. Спадзяюцца, што ў кірмашы прыймуць учасьце гаспадарчыя кругі Латвіі, Эстоніі, а нават Саветаў і Літвы.

Курс грошай. За залаты доляр плацяць 9 зл. 21 гр., за доляр у банкноце(паперка)— 7 зл. 55 гр., за рубель золатам—4 зл. 93 гр.

Прыймаецца падпіска на 1933 г. на 1-ую беларускую коопэратыўна-гаспадарчую часопісь

«Самапомач».

„САМАПОМАЧ" ёсьць першай, а да сягоньня на ўсе зах.-беларускія землі адзінай беларускай часопісьсю, якая займаецца коопэрацыяй і гаспадаркай.

„САМАПОМАЧ" знаёміць сваіх чытачоў з сапраўдным абліччам коопэрацыі, з ейнымі здабычамі ў іншых народаў і з магчымасьцямі розьвітку яе на землях беларускіх.

„САМАПОМАЧ" будзіць народ беларускі да самастойнага гаспадарчага жыцьця, як асновы быту ўсенароднага.

„САМАПОМАЧ" выходзіць што месяц і каштуе, з перасылкай, на год 3 зл., на паўгоду—1 зл. 75 граш., на тры месяцы — 1 зл. Заграніцу — ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі: VILNIA (Wilno), Polackaja 4—10. — Грошы пасылаць праз "П.К.О." на конто выдаўца і рэдактара інж. Клімовіча № 180.485.

Да нас пішуць.

Злосная конкурэнцыя.

Задубеньне, Крывіцкай гм., Вялейскага пав. Дня 7 г. м. моладзь нашай вёскі і суседняй — Каранішчы — з дазволу для Будслаўскага гуртка Бел. Інст. Гасп. і Культуры — ладзіла ў сваёй вёсцы беларускае прадстаўленьне. Ставілі „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам" і „Зьбянтэжаны Саўка." Вясковыя артысты-аматары адыгралі на сцэне прадстаўленьне вельмі ўдала. Відаць, што многа палажылі працы. Народу сабралася на прадстаўленьне многа. Словам, культурную працу моладзі ў нас аценілі і старэйшыя.

Разумеюць нашы людзі, што добрае і што благое. Але, на жаль, ёсьць яшчэ — хоць ня шмат — і такія, што благое ад добрага ня могуць адрозьніць. Гэтак напр. падчас апошняга беларускага прадстаўленьня ў нас выявілі сябе гэткімі сапраўднымі сьляпцамі два-тры хлапцы. Апрача сваей мысьлёвай тупасьці, выявілі яны і дзікую ўпорыстасьць, вартую лепшай справы. Пры гэтым паказалі яны і здольнасьці арганізацыі, але так-жа дурной і злоснай. А было гэта так:

Аднача сна з беларускім прадстаўленьнем гэтыя тупалобыя хлапцы задумалі зладзіць вечарыну танцаў. Нанялі яны музыкантаў і пачалі запрашываць моладзь, што прышла ўжо на прадстаўленьне беларускае, каб ішла да іх танцаваць і ня йшла на прадстаўленьне. Рэч зразумелая, што гэткіх запросінаў ніхто не паслухаў і ўсе пашлі на прадстаўленьне, а вечарына танцаў асталася толькі для самых ейных арганізатараў.

Пішу гэта не дзеля таго, каб пасьмяяцца з гэтых злосных канкурэнтаў, але каб выявіць нядобры паступак іх дзеля агульнай пагарды яго, каб другім разам, або ў іншым мейсцы ён не паўтараўся. А Вам, моладзь, што горнецеся да культуры, чэсьць і слава!

Глядзельнік.

Арганізуюць беларусаў паказённаму.

Будслаў, Вялейскага пав. У нас ніяк не разьвіваюцца польскія арганізацыі. А відаць некаму яны патрэбны, хоць на паказ. Сьпярша на паказ арганізаваў беларусоў папольску мяйсцовы войт. Не ўдавалася яму гэтая работа. Відаць, абдрыдла яна яму і ён кінуў яе. Але прышоў „3-ці май" і трэба было некаму паказаць, што і нашы беларусы гэта палякі. Трэба было машыраваць, паказаць на вуліцы, што тут жывуць палякі. Трэба было выступіць нейкай польскай арганізацыі публічна, каб заманіфэставаць польскае, не дзяржаўнае, але народнае сьвята. А тут няма каму. Дык на скорую руку ўзяўся зарганізаваць гэту справу "наш" камандант рээрвістаў. Пашоў ён у вёску, папісаў і „фэртік"(гатова). Нешта-ж вышла, але бяз душы і надта вяла, ведама — паказённаму. Ды лепш і быць ня можа, бо гэта ў нас не на месцы.

П. В.

Польскі ксёндз агітуе проціў беларускіх прадстаўленьняў.

Крывічы, Вялейскага пав. Дня 30 красавіка с. г. у нас было зладжана белурускае прадстаўленьне. Паліцыя аднеслася да беларускага прадстаўленьня, трэба сказаць праўду, вельмі прыхільна. Камандант мяйсцовага пастарунку паліцыі нават сам запрашаў артыстаў-аматараў, каб ішлі прадстаўляць на сцэну пабеларуску. А гэта дзеля таго, каб сьцягнуць як больш людзей, бо даход з прадстаўленьня прызначаны быў на „Пажарную Стражу," а камандант ёсьць начальнікам гэтай арганізацыі. І праўда, камандант не памыліўся: народу набралася, як ніколі. За білеты выручылі 80 зл. даходу.

Не спадабалася ўсё гэта тутэйшаму ксяндзу-паляку Крапіўніцкаму дзеля таго, што, прадстаўленьне было беларускае, а ня польскае. Сьпярша ён агітаваў проціў беларускага прадстаўленьня; вычаўпаў розна на Беларусоў, называючы іх і камуністымі і масонамі, каталіком прыказваў ня йсьці на прадстаўленьне беларускае, а каб людзей адцягнуць ад гэтага прадстаўленьня, заказаў свайму колу „Стов. млодзежы польскей" наладзіць у той жа час вечарыну. Але гэтыя натугі зьвярынага нацыяналізму кс. Крапіўніцкага нічога не памаглі—беларускаму прадстаўленьню не пашкодзілі. Адно толькі паказалі яны, чаго варты такія ксяндзы і якой справай яны заняты ў нашым краю.

Мне здаецца, што польскія ксяндзы і расейскія папы беларусаў не перамогуць і прыдзе час, што беларускаму руху паддадуцца: або паўцякаюць з нашага краю, або возьмуцца за душпастырскую працу для дабра Веры і нашага Народу.

В. П.

Грамадзкая праца сьвяшчэньніка — беларуса.

Ласіца, Пастаўскага пав. Увосені 1932 году прыехаў да нас з Вільні сьвяшчэньнік — беларус А. Коўш. Перад ягоным прыездам адчувалі мы ўпадак маральны, а яшчэ большы заняпад нацыянальны. Да гэтага заняпаду спрычыніліся папярэднікі сьвяшчэньніка Каўша, як сьвяшчэньнік Кадлубоўскі,Маеўскі, якія займаліся тут русыфікаваньнем беларускіх сялян. Праз упайваньне ў народ маскоўшчыны, адпіхалі яны ад царквы больш сьведамых беларусаў, а нясьведамых проста русыфікавалі. Дзеля таго што шмат большая частка сялян ласіцкай парафіі уважае сябе за беларусаў, у царкве бывала звычайна 10-15 асоб. І тыя ішлі не маліцца, а толькі пасьмяяцца з аднолькавых на кожную нядзелю пропаведзяў сьвяшчэньніка.

Зусём інакш прадстаўляецца справа цяпер. Кожную нядзелю і ў кожнае сьвята зьбіраецца ў царкву шмат народу, гдзе сьвяшчэньнік А. Коўш гаворыць беларускаму народу пропаведзі у роднай беларускай мове. У пропаведзях, побач з справамі царкоўнымі, парушае вельмі часта пытаньні нацыянальныя. Казаньні гэтыя любяць слухаць праваслаўныя, а таксама і каталікі, якія вельмі часта прыходзяць у царкву паслухаць беларускіх казаньняў. Наагул сьвяшчэньнік А. Коўш стараецца быць з народам у як найбліжэйшых адносінах.

У Ласіцкай парафіі дагэтуль няма ніякай беларускай арганізацыі. Дзеля таго сьвяшчэньнік А. Коўш можа працаваць на грунце беларускім толькі ў зьвязку з царквой. У хуткім часе трэба падумаць аб заснаваньні тут Гуртка Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

С. М.

Развал корпорацыі „Скорынія"

Даўно ўжо чуліся нелады ў польска-беларускай корпорацыі „Скорынія", але дагэтуль яны ладзіліся „сямейным" спосабам, ня выключаючы з гэтых спосабаў і бочкі з півам. Апошнімі днямі гэныя нелады „скорынчыкаў" прынялі форму развалу і самой арганізацыі. З невялічкай гэнай групкі раптам выступіла аж 4-ох сяброў: Я. Зянюк, М. Шчасны, П. Шчасны і Ч. Ханяўка. Апрача гэтых, як нас інфармуюць, маюць быць „пабегі" з „Скорыніі" і далей.

Пры гэтым не ад рэчы зазначыць, што траіх спасярод выступіўшых студэнтаў з корпорацыі „Скорынія" зьяўляюцца ейнымі закладчыкамі.

Але няма тут з чаго і дзівіцца, калі і сам тварэц усяе сучаснае беларуска-польскае угоды, пан Антоні Луцкевіч ужо каля двух месяцаў раптоўна „захварэў" на сэрца, а дахтары яму „забаранілі" займацца грамадзкай справай і ён пакорна іх паслухаў.

Аб гэтым шмат чаго трэба было-б выявіць, але ў зьвязку з некаторымі паважнейшымі справамі, ад гэтага пакульшто ўстрымліваемся.

С. В.

Часопісі надасланыя ў рэдакцыю.

Добрий Пастир (украінскі рэлігійны журнал) Рік III, 1933. № 1 Станиславів—Перемишль; бач. 84.

Orient kwartalnik poświęcony sprawom Wschodu. Warszawa, Miodowa 7.

Sprawy Narodowościowe — czasopismo poświęcone sprawom narodowościowym. Rok II!, Nr. 6. Październik—Grudzień 1932 r Даволі абшырная, хоць не бесстаронная хроніка з беларускага жыцьця пад Польшчай. Warszawa, Nowy Świat 21.

Oriens dwumiesięcznik poświęcony sprawom religijnym Wschodu. Marzec — Kwiecień 1933. Wydaje Misja Wschodnia O.O. Jezuitów w Polsce. Adres redakcji: Kraków, Kopernika L. 26.

Biuletyn Polsko-Ukraiński, miesięcznik. Rok II, Nr. 3(5) Kwiecień 1933.

Przegląd Wschodni, Dwutyg. poświęcony badaniu stosunków gospodarczych ZSSR. Rok II, Nr. 6. Warszawa, Wspólna 32.

Кооперативна Республика, економічно-суспільний місячник, Львів, Річн. VI, Ч. 5, травень.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.